ючы на дарозе агонь, здабыты трэннем дрэва аб дрэва. Такі ахоўны агонь павінен гарэць дзень і ноч. У якасці абярэга ўжывалі *абыдзённікі*, напрадзеныя і вытканыя за адну ноч: іх закопвалі па абодвух баках вёскі і на тых месцах ставілі крыж.

*Літ.*: Беларуская міфалогія. Мн., 2002. С. 177—182.

*У. А. Васілевіч.*

**ХАЛЕ́РА**, дэманалагічная постаць хваробы. Дзякуючы яе пашыранасці, як і інш. немачаў (воспы, ліхаманкі, чумы), у народзе ствараліся разнастайныя мясцовыя ўяўленні персаніфікаванага вобраза Х. Яе малявалі то халоднай прыгажуняю, якая махае з-за могільніка на сяло чырвонай ці чорнай хусцінкаю, з-за чаго людзі мруць, як мухі; то прыгожай, белай, як малако, дзяўчынаю, апранутай ва ўсё белае; то жахлівай жанчынаю з доўгімі светлымі валасамі і бліскучымі вачыма, якая найчасцей увесну раскідвае на вялікую адлегласць зерне хваробы, вымаючы яго з невычэрпнага кошыка і прымешваючы да агароднага насення, і тое робіцца заражанае; то высокай худой кабецінаю, сіняй, нібы пуп, прыбранай ва ўсё чорнае; то чорнай, страшэнна брыдкай бабаю, злепленай нібы з імглы — дзе яна пяройдзе, там народ адразу пачынае паміраць; то жанчынай на каровіных нагах, якая раз'язджае на тройцы вараных коней і любіць нюхаць табаку; то ў выглядзе худога чалавека ці жывёлы, што, ходзячы ўночы па хатах, атручвае квас і інш. пітво, пакінутае непакрытым; то паўстае беднай жанчынаю, якая просіцца, каб яе падвезлі, а даехаўшы да вёскі, косіць старых і малых. Х. мае здольнасць хадзіць па вадзе, заражаючы яе. Нездарма ў народзе казалі: «У халеру і жаба не квакне». Існавала павер'е, што калі першага, хто захварэў на Х., пахаваць жыўцом, то разам з хворым пахаваецца і сама хвароба. Злосныя сабакі могуць не ўпусціць Х. ў двор. Каб яна не прабралася ў вёску, стараліся нікога і нічога не прапускаць, раскладва-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ